Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

18 СНЕЖНЯ 2007 г. АЎТОРАК
№ 240 (26105)
Кошт 380 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.



## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫ ГОД

Працягваецца падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2008 года.
Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы | на 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 8800 | 26400 | 52800 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 8300 | 24900 | 49800 |
| 63858 (ведамасны) | 14000 | 42000 | 84000 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрства культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 12800 | 38400 | 76800 |


## «Прамыя лініі»: толькі ў «Звяздзе»!

### КАМУ ПОЙДЗЕ САЦЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА?

З 17 снежня ў Беларусі адначасова з увядзеннем новага закона аб ільготах пачнуў дзейнічаць Указ аб некаторых мерах дзяржаўнай падтрымкі насельніцтва. Каго ён датычыцца, што канкрэтна прадугледжваецца ў гэтым дакуменце і ў якім прынцыпе будзе прадастаўляцца сацыяльная дапамога цяпер? Гэтыя пытанні стануць тэмай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Пятроўны СЯРГЕЕВАЙ.** ***Такім чынам, увага! Наша «прамая лінія» будзе праходзіць 19 снежня з 14.00 да 15.30 па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія званкі прымаюцца па мінскім нумары 287 17 57.***

### БУДЗЬ ЗДАРОВЫ, НЕ КАШЛЯЙ!

Аб захворваннях органаў дыхальнай сістэмы, аб тым, як распазнаць першыя прыметы ангіны і пнеўманіі, астмы і грыпу, аб наступствах цяжкіх хвароб лёгкіх і метадах іх лячэння мы паговорым на чарговай «прамой лініі». У ёй возьме ўдзел **кіраўнік аддзела дыягностыкі і тэрапіі неспецыфічных захворванняў органаў дыхання НДІ пульманалогіі і фтызіятрыі Ірына Міхайлаўна ЛАПЦЕВА.** «Прамая лінія» адбудзецца ***21 снежня ў пятніцу з 12.00 да 13.30 гадзін па тэлефонах 8(017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8(017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шайко).***

## «Дажынкі-2008» — у Оршы і Аршанскім раёне

Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2008» пройдзе ў другой дэкадзе верасня 2008 года ў гарадзе Орша і Аршанскім раёне. Аб гэтым **БЕЛТА** паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта Беларусі.

## ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

20 снежня 2007 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца заключнае пасяджэнне восьмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Школа падаткаплацельшчыка

## З ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ — У РАНГ ПРЫВАТНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА

*На пытанні чытачоў «Звязды» адказвае начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Галіна РАДЗЮКЕВІЧ.*

**— Індывідуальным прадпрымальнікам у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта дзяржавы ад 28 чэрвеня 2007 года № 302 «Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку стварэння індывідуальным прадпрымальнікам прыватнага ўнітарнага прадпрыемства і яго дзейнасці» арганізоўваецца ўнітарнае прадпрыемства. Як на практыцы ажыццяўляецца працэдура такога пераходу?**

**Арцём Лянец,** *г. Мінск.*

— Артыкулам 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падатках на даходы і прыбытак» вызначана, што затраты па вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, тавараў (работ, паслуг), якія ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, з'яўляюцца вартаснай ацэнкай прыродных рэсурсаў, сыравіны, матэрыялаў, паліва, энергіі, асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў, працоўных рэсурсаў і іншых расходаў на іх вытворчасць і рэалізацыю, што адлюстроўваецца ў бухгалтарскім уліку.

Такім чынам, запазычанасць індывідуальнага прадпрымальніка перад пастаўшчыкамі за набытыя тавары (работы, паслугі), якія выкарыстоўваліся ў працэсе ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, згодна з вышэйназваным палажэннем, павінна быць пераведзена прыватнаму ўнітарнаму прадпрыемству, якое і будзе рабіць кампенсацыю такой запазычанасці на агульных падставах. Расходы індывідуальнага прадпрымальніка, якія былі зроблены ў працэсе ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, але аплачаны прыватным унітарным прадпрыемствам, не ўключаюцца прыватным прадпрыемствам у склад затрат, якія ўлічваюцца пры вылічэнні прыбытку, што абкладаецца падаткам, бо гэтыя расходы не звязаны з вытворчасцю і рэалізацыяй прадукцыі прыватным унітарным прадпрыемствам.

Асобна трэба адзначыць, што з моманту выдачы пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі ўнітарнага прадпрыемства палажэнне абмяжоўвае індывідуальнага прадпрымальніка ў заключэнні дагавораў, якія накіраваны на ажыццяўленне ім прадпрымальніцкай дзейнасці. Такая дзейнасць індывідуальнага прадпрымальніка з'яўляецца незаконнай. Даходы, якія атрыманы ад яе ажыццяўлення, спаганяюцца ў мясцовыя бюджэты ў судовым парадку. Пры гэтым індывідуальны прадпрымальнік мае права выконваць абавязкі па раней заключаных дагаворах да моманту іх пераўступкі прыватнаму ўнітарнаму прадпрыемству на працягу вызначанага тэрміну.

У сувязі з гэтым у дадзенай сітуацыі індывідуальнаму прадпрымальніку мэтазгодна да моманту пераўступкі абавязкаў прыватнаму ўнітарнаму прадпрыемству ажыццявіць аплату пастаўшчыкам (прадаўцам) і ўлічыць адпаведныя сумы расходаў пры падаткаабкладанні даходаў у парадку, вызначаным правіламі прадастаўлення падатковых вылікаў з даходаў фізічных асобаў, якія падлягаюць падаткаабкладанню, звязаных з ажыццяўленнем індывідуальнымі прадпрымальнікамі і прыраўнаванымі да іх для мэтаў падаткаабкладання асобамі (прыватнымі натарыусамі) прадпрымальніцкай дзейнасці, якія зацверджаны Указам кіраўніка дзяржавы ад 3 красавіка 2007 года № 162.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

Рэпартаж з колаў

# «ЗВЯЗДА» Ў ГАСЦЯХ У «ЗВЯЗДЫ»

**Хадзіць у госці заўсёды прыемна. Асабліва калі цябе запрашаюць на дзень нараджэння, і тым больш — на юбілей. Былому калгасу «Звязда», які цяпер з'яўляецца прыватным сельскагаспадарчым унітарным прадпрыемствам «Звязда-2003», споўнілася 75 гадоў.**

Выязны дэсант «Звязды» ў складзе намесніка галоўнага рэдактара Анатоля Сланеўскага, журналістаў Валянціны Доўнар, Інгі Міндалёвай, Уладзіміра Пернікава і фотакарэспандэнта Марыі Жылінскай накіраваўся ў Чачэрскі раён, у пасёлак Залессе, дзе месціцца цэнтральная сядзіба гаспадаркі і культурны цэнтр, у якім ладзілася святочнае мерапрыемства. З сабой мы захапілі падарункі і фірменныя сувеніры з лагатыпам газеты.

«Адмахалі» 300 км і трапілі з карабля на баль: «Звязду-2003» віншавалі першыя асобы раёна і кіраўнікі мясцовых прадпрыемстваў. У тым ліку першы намеснік старшыні Чачэрскага райвыканкама Анатоль Буслаў, дырэктар ПСУП «Колас-2003» Мікалай Алісейка, дырэктар мясцовага філіяла Белаграпрамбанка Кацярына Кудрачова, дэпутаты раённага Савета Васіль Мамекін і Васіль Калбасаў. Гаспадыня свята — дырэктар ПСУП «Звязда-2003» Галіна Трыбунах ледзь паспявала прымаць сардэчныя віншаванні і падарункі.

Прадпрыемства — гэта ў першую чаргу калектыў, людзі. Таму пасля выступлення афіцыйных асобаў надышоў час Галіне Пятроўне раздаваць падарункі. Іх атрымалі лепшыя працаўнікі гаспадаркі: механізатар Мікалай Брайкоў, жывёлавод Фёдар Малашкін, малады спецыяліст, інжынер па ахове працы Мікалай Адзінцоў. Не былі забытыя і ветэраны. Як адзначыла ў сваім выступленні Галіна Трыбунах, залатым фондам раёна былі і застаюцца ветэраны калгаса Адам Іванавіч Гавароўскі, Таццяна Фёдараўна Трушкова, Іван Паўлавіч Міхеенка.

Калгас «Звязда» быў утвораны ў 1932 годзе шляхам аб'яднання невялікіх сялянскіх гаспадарак. Сёння гэта заможнае прадпрыемства, якое няспынна нарошчвае аб'ёмы вытворчасці. Новы дырэктар гаспадаркі — Галіна Трыбунах на сваёй пасадзе ўсяго паўгода, аднак станоўчыя вынікі яе працы ўжо відавочныя.

— Мы з Галінай Пятроўнай не проста супрацоўнічаем, — расказвае старшыня Залескага сельскага Савета дэпутатаў Наталля Шаўцова, — мы з ёй сябруем. Для плённай сумеснай работы старшыні гаспадаркі і старшыні сельвыканкама трэба добра разумець адзін аднаго. Па-іншаму і быць не можа. Менавіта так — падтрымліваючы адна адну — мы і працуем.



*Трактарыст з пяцідзесяцігадовым стажам Іван МІХЕЕНКА.*



*«Звяздоўская» змена.*

Нам, звяздоўцам, было вельмі прыемна, што работнікі «Звязды-2003» на сваім свяце ўзгадалі і юбілей газеты. У гаспадарцы, зразумела ж, чытаюць яе не ўсе. Але свае прыхільнікі ёсць.

— Я 20 гадоў тут на пошце працую, — гаварыла начальнік аддзялення сувязі Ніна Яўгенаўна Акінша. — Дык вось за гэты час Васіль Мацвеевіч Хрысцін іншай газеты ні разу не выпісаў. Толькі «Звязду»!

З ёю ж у сваім Навагрудскім раёне жыла Ірына Уладзіміраўна Пералайка. Працавала даяркай, выгадавала ні многа ні мала пяцёра дзяцей. Не так даўно пераехала ў Залессе — бліжэй да дачок. Што цікава, да дэкрэтных адпачынкаў яны таксама працавалі тут даяркамі. І дзяцей у іх амаль, як у маці — па чацвёра... Пакуль.

— У адной — усе сынкі, — гаварыла Ірына Уладзіміраўна. — У другой — папалам: два хлопчыкі, дзве дзяўчынкі. Зяці, дзякуй Богу, харошыя. Але ж гадаваць дзяцей усё роўна цяжка... Ва ўсе часы. Галоўнае — здароўе не страціць.

У гэтым нашай падпісчыцы, на вялікі жаль, не пашчасціла. Але ж трымаецца — дапамагае выхоўваць унукаў, трымае сціплую гаспадарку. І «Звязду» выпісвае. У ёй, казала, «ну ўсё падабаецца! Вось толькі на прыз не шанцуе».

На Залессе і ваколіцы не выпала, пакуль, ні халадзільніка, ні тэлевізара. А вось нашы фірменныя кепачкі, майкі, календары дасталіся многім — удзельнікам звяздоўскай віктарыны, падпісчыкам Васілю Мацвеевічу і Віктару Яўгенавічу Хрысціным (аднафамільцы), Таццяне Васільеўне Шкурынавай...

Уважліва нас там слухалі, як сваіх, прымалі. Ды яно і зразумела:

— Здавалася б, такія розныя па роду дзейнасці, запаленыя ў розных кутках Беларусі дзве «Звязды» служаць адной агульнай справе, станаўленню і развіццю нашай дзяржавы, — адзначыла Галіна Трыбунах. — Спадзяёмся, што сённяшняе мерапрыемства стане новай кропкай адліку ва ўмацаванні партнёрскіх адносінаў.

І мы на гэта будзем спадзявацца, бо ехалі ж на чужы дзень нараджэння з віншаваннямі і падарункамі, а апынуліся на свяце, дзе нас віншавалі. І дадому паехалі, як сапраўдныя імяніннікі — з падарункамі. Дзякуй, гасцінная Чачэрская зямля! Цяпер дзве «Звязды», якія ззяюць на адлегласці ў 300 км, сталі бліжэйшымі.

**Анатоль СЛАНЕЎСКІ,**
**Валянціна ДОЎНАР,**
**Інга МІНДАЛЁВА,**
**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**
*Чачэрскі раён.*

Мы едзем!

## ХАЙ ШЫРЫЦЦА КОЛА СЯБРОЎ!

**Непрадказальны лёс у нашых суперпрызоў: то, здаралася, аж два ў адну сям'ю, то ніводнага на цэлы раён. Але гэта — зазначым — да пары...**

Сёння маленькі звяздоўскі дэсант з суперпрызам у выглядзе каляровага тэлевізара «Віцязь», які выйграла Яўгенія Максімаўна Туркова з в. Канашы, упершыню едзе ў Гарадоцкі раён Віцебскай вобласці. Далекавата, вядома, але ж, калі чалавек выйграў...

Такім чынам, сёння ў 12 гадзін дзень падпісчыка «Звязды» адбудзецца ў актавай зале Шумілінскага райвыканкама, у 16.00 — у вялікай зале Гарадоцкага... З уручэннем суперпрыза...

Назаўтра, 19 снежня, у 10 гадзін мы будзем рады вітаць сваіх падпісчыкаў, сваіх сяброў-паштавікоў у Віцебску, у 15-м аддзяленні паштовай сувязі (Маскоўскі праспект, д. 10), у 12.30 — у актавай зале Дубровенскага райвыканкама, у 15.30 — у малой зале Аршанскага райвыканкама.

У праграме, як заўсёды, узаемныя знаёмствы, расказ пра гісторыю «Звязды» і яе сённяшні дзень, прэзентацыя самых папулярных звяздоўскіх рубрык і кніг, віктарына і розыгрыш прызоў, жарты і байкі са скарбонкі народнага гумару... Прыходзьце, прыводзьце сваіх і, зразумела ж, не забудзьцеся падпісацца, выслаць картку на розыгрыш прызоў. І тады, магчыма, мы прыедзем да вас!

**Валянціна ДОЎНАР, Марына БЕГУНКОВА, Сяргей ПРОТАС.**



## КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже административного здания (об. пл. 480,2 кв.м), здания склада (об. пл. 35,0 кв.м), расположенных по адресу: г. Борисов, ул. Минская, 21. Площадь земельного участка — 0,2509 га. Начальная цена (снижена на 20 %) — 92 400 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.09.2007 г. Аукцион состоится **29 декабря 2007 г**. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28 декабря 2007 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Тел: (8017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

УНП 690324015.

## ОАО «Борисовское СМУ» совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводят открытый аукцион по продаже трансформатора масляного марки — ТМЗ 400/10-70 УЗ, разъединителя ВНРу 10/400-УЗ и шкафа ввода ШВВЗЛ (все 1983 года выпуска). Начальная цена: 17 327 120 бел. руб. с НДС. Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с, указанный в условиях проведения аукциона. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 22.01.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.01.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны (8017) 2246134, (801777) 35348.**
**Наш сайт: www.rlt.by.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости». УНП 690324015.


## СТРАТЭГІЯ ЛІДАРСТВА

Закрытае акцыянернае таварыства Банк ВТБ (Беларусь) мае намер да 2011 года ўвайсці ў тройку вядучых банкаў Беларусі, паведаміў на прэс-канферэнцыі старшыня праўлення банка Уладзімір Іваноў. Сёлета за 11 месяцаў асноўныя паказчыкі дзейнасці ЗАТ Банк ВТБ (Беларусь) выраслі больш як у два разы: статутны фонд склаў 18,7 мільёна долараў ЗША, уласны капітал — 53,3 мільёна, актывы — 372,4 мільёна долараў. Да 2010 года актывы фінансавай установы дасягнуць ужо 1,5-1,8 мільярда долараў. У красавіку гэтага года ААТ Банк ВТБ (Расія) набыў кантрольны пакет акцый беларускага банка: зараз яго ўдзел у статутным капітале складае 64,9 працэнта. Як зазначыў прэзідэнт-старшыня праўлення ААТ Банк ВТБ (Расія) Андрэй Касцін, прыярытэтным напрамкам дзейнасці беларускага банка будзе рэальны сектар эканомікі, аднак работа з фізічнымі асобамі таксама будзе актывізаваная.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## Мікалай СМУНЁЎ: «ПОШТА, ЯК КАРАБЕЛЬ У МОРЫ ПАСЛУГ»

**Сёння дырэктар Віцебскага філіяла РУП «Белпошта» Мікалай Раманавіч Смунёў прымае шматлікія віншаванні. Яму — 60.**



Перад тым як сустрэцца з юбілярам, я пагутарыў з яго калегамі: далёка хадзіць не трэба было. Напрыклад, паштальёнка, якая прыносіць пошту ў віцебскі карпункт, завочна павіншавала «галоўнага паштальёна» Віцебшчыны і папрасіла пажадаць яму здароўя. У аддзеле кадраў, калі папрасіў паглядзець біяграфічную даведку, адразу адзначылі: «Запісаў там няшмат, пошце чалавек усё жыццё аддаў.»

Пасля службы ў арміі, у 1969-м, Мікалай Смунёў пачаў працаваць электрамеханікам віцебскага паштамта. Праз пяць гадоў стаў інжынерам па механізацыі. У 2000 годзе прызначаны дырэктарам віцебскага філіяла «Белпошты».

А вось яшчэ некаторыя словы калег Мікалая Раманавіча: «Рабоце ён аддае ўсяго сябе. Добры кіраўнік, цэніць людзей, паважае за прафесіяналізм».

Сустрэцца з юбілярам было складана: адно — заняты па службе, потым сесія абласнога Савета дэпутатаў, а ў гарадскім — Мікалай Раманавіч Смунёў узначальвае бюджэтную камісію.

Дарэчы, напэўна, мала хто з выбаршчыкаў ведае, што менавіта, дзякуючы дэпутату Смунёву на праспекце Фрунзе ў свой час адкрылі новы магазін «Ніка».

І што па ініцыятыве гэтага народнага выбранніка шмат зроблена для прывядзення ў парадак вуліц. А хто не памятае ранейшае галоўнае паштовае аддзяленне Віцебска? Кажуць, Мікалай Раманавіч асабіста намаляваў новы «варыянт», які зараз проста радуе вочы.

— Карабель, што ідзе па моры паслуг. Такім я ўбачыў паштамт, — успамінае юбіляр.

А ці праўда, што ў вёсцы Старое Сяло нават возера называюць Смунёўскім?

— Так. Гэта дачнае месца Краява, што за вёскай. Там возера і не было наогул. У 1993—1994 гадах было вельмі засушлівае лета. У 1995-м гэта возера было выкапана. Потым запоўнена вадой. А вакол возера лес з абляпіхай. Я, наогул, калі нешта абяцаю людзям, заўсёды выконваю.

І, безумоўна, галоўнае для мяне — работа. Я прайшоў усе этапы станаўлення сувязі, пачынаючы ад першых сродкаў механізацыі у 1970-х, калі з'явіліся першыя электрамеханічныя машыны, да сучасных інфармацыйных тэхналогій. Калісьці быў галоўным будаўнікам аддзялення перавозкі пошты. Сёлета завершана камп'ютарызацыя паштовых аддзяленняў Віцебшчыны.

— У Віцебскай вобласці 6,5 тысячы населеных пунктаў, што больш, чым у іншых рэгіёнах рэспублікі. Ёсць і такія, дзе толькі па 5, 10 двароў. Для іх абслугоўвання трэба больш паштальёнаў?

— Так. Але гэта жыццёва неабходна. Многім з іх даводзіцца амаль штодзень пераадольваць шмат кіламетраў... Самае вялікае багацце — гэта запас кваліфікаваных кадраў. Я заўсёды збіраў вакол сябе разумных людзей. Яны — мая самая галоўная апора ў жыцці, у рабоце.

...Я вельмі здзівіўся, калі пачуў, што Мікалай Раманавіч піша вершы. Дзед яго — таксама пісаў. І брат старэйшы. У завяршэнні нашай размовы імяніннік прачытаў мне некалькі твораў: верш — роздум пра жыццё, верш, прысвечаны жонцы. Ён дакладна памятае, калі яны пазнаёміліся, і штогод у гэты дзень дорыць ёй шыкоўны букет. У іх два сыны, адзін з якіх папулярны аўтар песень. У юбіляра два ўнукі — сапраўдная падстава для гонару.

А тое ж возера? Хто такое з нас зрабіў у жыцці? Мікалай Раманавіч поўны сілаў і новых планаў. Хай усе яны рэалізуюцца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 638

# АБ НЕКАТОРЫХ МЕРАХ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАДТРЫМКІ НАСЕЛЬНІЦТВА

У мэтах узмацнення дзяржаўнай падтрымкі насельніцтва ў сувязі з упарадкаваннем сацыяльных ільгот **пастанаўляю**:

1. Дзяржаўная падтрымка насельніцтва ажыццяўляецца ў форме:

1.1. дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі (штомесячнай сацыяльнай дапамогі і (або) аднаразовай сацыяльнай дапамогі) на набыццё прадуктаў харчавання, лекавых сродкаў, тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, адзення, абутку, праязных білетаў, школьных прылад і на іншыя патрэбы для забеспячэння нармальнай жыццядзейнасці;

1.2. безнаяўных жыллёвых субсідый для частковай кампенсацыі платы за карыстанне жылымі памяшканнямі, іх тэхнічнае абслугоўванне, камунальныя паслугі (гарачае і халоднае водазабеспячэнне, каналізацыя, газ, электрычная і цеплавая энергія, карыстанне ліфтамі, вываз і абясшкоджванне цвёрдых бытавых адходаў) і адлічэнняў на капітальны рамонт.

2. Устанавіць, што:

2.1. штомесячная сацыяльная дапамога прадастаўляецца сем'ям і грамадзянам, якія пражываюць асобна або вядуць раздзельную гаспадарку (далей — сем'і (грамадзяне), пры ўмове, калі іх сярэднедушавы даход па аб'ектыўных прычынах не перасягае 100 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага Урадам Рэспублікі Беларусь, за два апошнія кварталы (далей — крытэрый патрэбнасці). Памер штомесячнай сацыяльнай дапамогі на кожнага члена сям'і, уключаючы кожнага студэнта (навучэнца) незалежна ад месца яго вучобы, а таксама на грамадзяніна, які пражывае асобна або вядзе раздзельную гаспадарку, — атрымальнікаў гэтай дапамогі складае дадатную розніцу паміж крытэрыем патрэбнасці і сярэднедушавым даходам сям'і (грамадзяніна), вызначаным у парадку, устаноўленым Урадам Рэспублікі Беларусь;

2.2. права на аднаразовую сацыяльную дапамогу маюць сем'і (грамадзяне), якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі*, якая аб'ектыўна парушае іх нармальную жыццядзейнасць, калі іх сярэднедушавы даход, што вызначаецца ў парадку, устаноўленым Урадам Рэспублікі Беларусь, не перасягае 120 працэнтаў крытэрыю патрэбнасці. Памер аднаразовай сацыяльнай дапамогі ўстанаўліваецца ў межах ад 50 да 500 працэнтаў крытэрыю патрэбнасці ў залежнасці ад цяжкай жыццёвай сітуацыі, у якой знаходзіцца сям'я (грамадзянін);

2.3. безнаяўныя жыллёвыя субсідыі прадастаўляюцца сем'ям (грамадзянам) пры ўмове, калі сума платы за камунальныя паслугі (гарачае і халоднае водазабеспячэнне, каналізацыя, газ, электрычная і цеплавая энергія, карыстанне ліфтамі, вываз і абясшкоджванне цвёрдых бытавых адходаў), вызначаная зыходзячы з устаноўленых Урадам Рэспублікі Беларусь для разліку гэтых субсідый нормаў (нарматываў) іх спажывання, і за карыстанне жылым памяшканнем, яго тэхнічнае абслугоўванне, адлічэнняў на капітальны рамонт у межах 20 кв. метраў агульнай плошчы на кожнага члена сем'і, які пражывае ў жылым памяшканні, перасягае:

20 працэнтаў сукупнага даходу сям'і (грамадзяніна), якая пражывае (які пражывае) у горадзе, пасёлку гарадскога тыпу;

15 працэнтаў сукупнага даходу сям'і (грамадзяніна), якая пражывае (які пражывае) у сельскім населеным пункце.

Памер штомесячнай безнаяўнай жыллёвай субсідыі сям'і (грамадзяніну) вызначаецца як розніца паміж сумай названай платы і сумай, што складае адпаведна 20 і 15 працэнтаў сукупнага даходу сям'і (грамадзяніна).

3. Дзяржаўная падтрымка ў форме штомесячнай сацыяльнай дапамогі і безнаяўнай жыллёвай субсідыі не назначаецца грамадзянам, якія пражываюць асобна або вядуць раздзельную гаспадарку або ў складзе сям'і:

якія з'яўляюцца курсантамі ваенных навучальных устаноў або ўстаноў адукацыі Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Камітэта дзяржаўнай бяспекі;

якія адбываюць пакаранне ў месцах пазбаўлення волі або знаходзяцца на прымусовым лячэнні;

якія кампенсуюць расходы па ўтрыманню дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні;

якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні ў дзяржаўных стацыянарных арганізацыях сацыяльнага абслугоўвання, дзіцячых інтэрнатных установах, дзяржаўных спецыялізаваных установах для непаўналетніх, якім патрэбна сацыяльная дапамога і рэабілітацыя, дзіцячых дамах сямейнага тыпу, дзіцячых вёсках (гарадках) або на дзяржаўным забеспячэнні ў дзяржаўных установах, што забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, у перыяд навучання ў гэтых установах у дзённай форме атрымання адукацыі, у тым ліку на падрыхтоўчых аддзяленнях;

якія з'яўляюцца непрацуючымі працаздольнымі асобамі, не зарэгістраванымі ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленні (аддзеле) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога (раённага) выканаўчага камітэта ў якасці беспрацоўных (акрамя асобаў, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, а таксама дзіцяці ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванага вірусам імунадэфіцыту чалавека);

якія з'яўляюцца непрацуючымі працаздольнымі асобамі, зарэгістраванымі ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленні (аддзеле) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога (раённага) выканаўчага камітэта ў якасці беспрацоўных, але не выконваюць патрабаванняў заканадаўства аб занятасці насельніцтва;

якія з'яўляюцца непрацуючымі працаздольнымі асобамі, зарэгістраванымі ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленні (аддзеле) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога (раённага) выканаўчага камітэта ў якасці беспрацоўных менш як тры месяцы на дату звароту па дзяржаўную патрымку. Названы тэрмін не прымяняецца да асобаў, зарэгістраваных у органе па працы, занятасці і сацыяльнай абароне на працягу месяца пасля:

звальнення з работы (службы) у выпадку ліквідацыі арганізацыі, спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, скарачэння колькасці або штату работнікаў;

дасягнення дзіцем узросту 3 гадоў, дзіцем-інвалідам і дзіцем, інфіцыраваным вірусам імунадэфіцыту чалавека, узросту 18 гадоў;

звальнення з воінскай службы;

завяршэння работы па праграме часовай занятасці або сезоннай работы;

завяршэння навучання ва ўстанове адукацыі;

вызвалення з месцаў пазбаўлення волі;

атрымання статусу бежанца або прадастаўлення прытулку;

змены месца жыхарства.

Дзяржаўная падтрымка ў форме штомесячнай сацыяльнай дапамогі і безнаяўнай жыллёвай субсідыі, акрамя выпадкаў, прадугледжаных у частцы першай гэтага пункта, не прадастаўляецца таксама сям'і (грамадзяніну), калі член сям'і (грамадзянін):

мае ў прыватнай уласнасці больш за адно жылое памяшканне (кватэру);

здае па дагавору найму (паднайму) жылое памяшканне;

здае па дагавору арэнды іншую нерухомую маёмасць (дачу, гараж);

з'яўляецца ўласнікам маёмасці прыватнага ўнітарнага прадпрыемства, месцам дзяржаўнай рэгістрацыі (месцам знаходжання) якога з'яўляецца жылое памяшканне, у якім пражывае сям'я (грамадзянін);

ажыццяўляў за кошт уласных сродкаў выязны турызм на працягу апошніх дванаццаці месяцаў перад датай звароту за назначэннем штомесячнай сацыяльнай дапамогі;

вучыцца ва ўстанове адукацыі за кошт уласных сродкаў;

мае зямельны ўчастак для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі або калектыўнага садоўніцтва, але не выкарыстоўвае яго для атрымання сельскагаспадарчай прадукцыі (акрамя адзінокіх інвалідаў I, II групы і грамадзян, якія дасягнулі 70-гадовага ўзросту).

4. Кіраўнікі дзяржаўных устаноў, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, могуць аказваць матэрыяльную дапамогу на праезд навучэнцам і студэнтам, якія маюць у гэтым патрэбу (незалежна ад прадастаўлення ім дзяржаўнай падтрымкі ў складзе сям'і ў адпаведнасці з пунктам 2 гэтага Указа), у парадку, устаноўленым Урадам Рэспублікі Беларусь:

якія вучацца за кошт рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, — са сродкаў, што выдзяляюцца на стыпендыяльнае забеспячэнне і накіроўваюцца на аказанне ім матэрыяльнай дапамогі, што атрымліваюцца ад пазабюджэтнай дзейнасці, а таксама з іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам;

якія вучацца на платнай аснове, — са сродкаў, што атрымліваюцца ад пазабюджэтнай дзейнасці, а таксама з іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

5. Дзяржаўная падтрымка насельніцтва, прадугледжаная гэтым Указам, не абкладаецца падаходным падаткам.

6. Службовыя асобы мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых арганізацый нясуць дысцыплінарную адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам аб працы аж да вызвалення ад займаемай пасады і адміністрацыйную адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам аб зваротах грамадзян за валакіту, бюракратызм, парушэнне парадку і тэрмінаў разгляду заяў грамадзян, у тым ліку за патрабаванне ў грамадзян залішніх дакументаў для прадастаўлення дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі і безнаяўных жыллёвых субсідый, невыкананне іншых патрабаванняў гэтага Указа пры вырашэнні пытання аб прадастаўленні дзяржаўнай падтрымкі сем'ям (грамадзянам).

7. Сем'і (грамадзяне) нясуць адказнасць за дакладнасць звестак аб даходах і маёмасці, што належыць членам сем'і (грамадзяніну) на праве ўласнасці, а таксама звестак аб змяненні складу сям'і і іншых даных, што прадстаўляюцца ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы і іншыя арганізацыі, якія ажыццяўляюць у адпаведнасці з гэтым Указам назначэнне і выплату дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі і безнаяўных жыллёвых субсідый.

У выпадку наўмыснага ўтойвання названых звестак (прадстаўлення недакладных звестак) сем'і (грамадзяне) пазбаўляюцца права на зварот за дзяржаўнай падтрымкай і атрыманне такой падтрымкі, устаноўленай гэтым Указам.

8. Зацвердзіць прыкладзеныя:

Палажэнне аб парадку прадастаўлення дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі;

Палажэнне аб парадку прадастаўлення безнаяўных жыллёвых субсідый.

9. Мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, іншым арганізацыям, якія ажыццяўляюць у адпаведнасці з гэтым Указам назначэнне і выплату дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі і безнаяўных жыллёвых субсідый, даваць растлумачэнні сем'ям (грамадзянам) аб парадку і ўмовах назначэння і выплаты дзяржаўнай падтрымкі, вызначанай у гэтым Указе.

10. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь:

пры фарміраванні бюджэту на чарговы бюджэтны (фінансавы) год прадугледжваць дадатковыя сродкі на стыпендыяльнае забеспячэнне для аказання матэрыяльнай дапамогі на праезд студэнтам і навучэнцам, якія маюць у гэтым патрэбу;

у трохмесячны тэрмін забяспечыць прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Указам і прыняць іншыя меры па яго рэалізацыі.

11. Кантроль за выкананнем гэтага Указа ўскласці на Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

12. Гэты Указ уступае ў сілу з дня ўступлення ў сілу Закона Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2007 года «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 147, 2/1336), за выключэннем пункта 10 і гэтага пункта, якія ўступаюць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання Указа.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.**
*14 снежня 2007 г., г. Мінск.*

** Для мэтаў гэтага Указа пад цяжкай жыццёвай сітуацыяй разумеюцца абставіны, складаныя для самастойнага вырашэння (поўная непрацаздольнасць па прычыне ўзросту або інваліднасці, няздольнасць да самаабслугоўвання ў сувязі з хваробай, патрэбнасць у тэхнічных сродках сацыяльнай рэабілітацыі, стыхійныя бедствы, катастрофы, пажары і іншыя абставіны).*

КУРСЫ ВАЛЮТ

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.12.2007 г. (для б/н разлікаў)**

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 154,00 |
| 1 еўра | 3 100,36 |
| 1 латвійскі лат | 4 449,49 |
| 1 літоўскі літ | 897,91 |
| 1 чэшская крона | 117,48 |
| 1 польскі злоты | 855,25 |
| 1 расійскі рубель | 87,19 |
| 1 украінская грыўня | 425,27 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў**
**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 24,7060 |
| 10 UAH | 48,6751 |
| 1000 BYR | 11,4499 |
| EUR | 35,6038 |

**Курс у гандлёвых кампаніях (на 17.12.2007 г.)**

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ООО «Агенство Владимира Гревцова» УПН 10002407 Лицензия Минсвязи № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 до 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

07240>

9771990763008

